# *§ 36–0. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны

**ПАЛІТЫКА «ЗАМІРЭННЯ АГРЭСАРА»**
**МЮНХЕНСКАЕ ПАГАДНЕННЕ**
**СІСТЭМА КАЛЕКТЫЎНАЙ БЯСПЕКІ**
**ДАМОВА АБ НЕНАПАДЗЕ**
**ВЕРСАЛЬСКА-ВАШЫНГТОНСКАЯ СІСТЭМА МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН**
**ЛІГА НАЦЫЙ**
**ПАЛІТЫКА ІЗАЛЯЦЫЯНІЗМУ**

**1. Агрэсіўная палітыка Германіі, Італіі і Японіі ў 1930-я гг.** У 1922 г. у Італіі да ўлады прыйшлі фашысты, а ў Германіі нацысты прыйшлі да ўлады ў 1933 г. Імкненне ўзяць рэванш за вынікі Першай сусветнай вайны вызначала агрэсіўныя знешнепалітычныя памкненні ўрадаў гэтых краін. *Ліга Нацый* не змагла забяспечыць палітычную стабільнасць у свеце.

Першая на шлях агрэсіўнай палітыкі пасля Першай сусветнай вайны стала Японія. У 1931–1932 гг. яна ўварвалася ў Маньчжурыю і захапіла гэтую паўночна-ўсходнюю тэрыторыю Кітайскай рэспублікі. У адказ на крытыку з боку Лігі Нацый Японія выйшла з гэтай міжнароднай арганізацыі.

У 1937 г. Японія распачала шырокамаштабную вайну супраць Кітая, імкнучыся дабіцца поўнага яго падпарадкавання. У 1937–1938 гг. Японія захапіла вялікія тэрыторыі Кітая, у тым ліку найбуйнейшыя гарады Шанхай, Нанкін, Пекін. Але вымусіць Кітай капітуляваць яна не здолела. Кітайскі народ узняўся на барацьбу з японскімі захопнікамі,

**Захоп Маньчжурыі Японіяй**



*Японскія войскі ў Маньчжурыі. 1931 г.*

у канцы 1938 г. японскі наступ быў спынены. Важную ролю ў гэтым адыграла дапамога Кітаю з боку СССР. Пасля падпісання ў 1937 г. савецка-кітайскай дамовы аб ненападзе пачаліся пастаўкі Кітаю савецкай зброі, у баях супраць Японіі ўдзельнічалі савецкія лётчыкі, іншыя ваенныя спецыялісты.

Захоп Японіяй Маньчжурыі стварыў пагрозу для Савецкага Саюза. У 1938 г. японскія войскі ўварваліся на савецкую тэрыторыю каля возера Хасан. У наступным годзе Чырвоная армія прыйшла на дапамогу саюзнай Манголіі, каб адбіць уварванне японцаў на яе тэрыторыю каля ракі Халхін-Гол. У абодвух выпадках японская армія пацярпела паражэнне.

Паражэнне японскіх войскаў на Халхін-Голе і падпісанне савецка-германскай дамовы аб ненападзе 23 жніўня 1939 г. на некаторы час знялі пагрозу агрэсіі Японіі супраць СССР.

Пасля прыходу да ўлады ў Германіі нацыянал-сацыялісты абвясцілі сваёй мэтай заваёву «жыццёвай прасторы» для нямецкай нацыі. У кастрычніку 1933 г. Германія выйшла з Лігі Нацый.

Успомніце, у чым заключалася палітыка ізаляцыянізму ЗША.

Насуперак Версальскай дамове А. Гітлер абвясціў, што Германія ўводзіць усеагульную вайсковую павіннасць, аднаўляе сваю армію і стварае ваенна-паветраныя сілы. Аднак замест пратэсту Вялікабрытанія падпісала ваенна-марское пагадненне з Германіяй. Яна, як і Францыя, апасалася магчымай вайны з Германіяй. ЗША, занятыя ў гэты час унутранымі эканамічнымі праблемамі, вярнуліся да традыцыйнай *палітыкі ізаляцыянізму*.

**Акупацыя Эфіопіі**

Знайдзіце значэнне слова «эмбарга». Якім чынам увядзенне нафтавага эмбарга супраць Італіі ў 1935 г. магло паўплываць на яе дзеянні?

У 1935 г. Італія акупавала Абісінію (Эфіопію) — апошнюю незалежную дзяржаву ў Афрыцы, што ўваходзіла ў Лігу Нацый. Ліга Нацый і дэмакратычныя дзяржавы выказалі пратэст, але адмовіліся прыпыніць італьянскую кампанію шляхам закрыцця Суэцкага канала для італьянскіх караблёў і ўвядзення нафтавага эмбарга супраць Італіі.

У 1936 г. А. Гітлер увёў войскі ў Рэйнскую дэмілітарызаваную зону на мяжы з Францыяй і Бельгіяй. Вядучыя еўрапейскія краіны зноў абмежаваліся толькі дыпламатычнымі пратэстамі.

## Грамадзянская вайна ў Іспаніі

У ліпені 1936 г. частка іспанскай арміі на чале з Ф. Франка ўзняла мяцеж супраць урада рэспубліканскай Іспаніі. У гэтай краіне распачалася грамадзянская вайна, у якой Італія і Германія дапамагалі нацыяналістам (так называлі сябе прыхільнікі Ф. Франка), а СССР падтрымліваў рэспубліканцаў. Іспанская рэспубліка пала. Ад 1939 г. у Іспаніі ўсталявалася дыктатура Ф. Франка.

## Стварэнне саюзу Германіі і Італіі

У 1936 г. А. Гітлер і Б. Мусаліні сфарміравалі *альянс (саюз)*, які меў мэтай задавальненне тэрытарыяльных амбіцый абодвух фашысцкіх дыктатараў. Альянс атрымаў назву *«Вось Берлін — Рым»*.

## Аншлюс Аўстрыі

У сакавіку 1938 г. Германія акупавала Аўстрыю. Гэтая падзея ўвайшла ў гісторыю як «аншлюс Аўстрыі». Большасць яе жыхароў прынялі далучэнне сваёй краіны да гітлераўскага рэйха без пратэсту.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, адкажыце на пытанне: як было патлумачана далучэнне Аўстрыі да Германіі?



*Апалчэнцы рэспубліканскай арміі Іспаніі*




*Нямецкія войскі ўступаюць у Судэцкую вобласць Чэхаславакіі. 1938 г.*

**Пазіцыя вядучых краін Еўропы ў дачыненні да Германіі**

**2. Палітыка «замірэння агрэсара». Мюнхенская дамова і яе роля ў развязванні вайны.** Кіроўныя колы Вялікабрытаніі і Францыі ў 1930-х гг. узялі курс на «замірэнне» Гітлера, задавальняючы яго прэтэнзіі, якія ўвесь час раслі. Галоўнай мэтай гэтай недальнабачнай і надзвычай небяспечнай палітыкі лідары абедзвюх краін абвясцілі падтрыманне міру любым коштам. Пры гэтым яны тайна меркавалі накіраваць нарастаючую нямецкую агрэсію на Усход, супраць Савецкага Саюза.

Гісторыкі лічаць, што палітыка замірэння агрэсара мела тры галоўныя прычыны:

1. Імкненне еўрапейцаў, якія толькі што перажылі сусветную вайну, не дапусціць новай маштабнай вайны. Палітычныя лідары дэмакратычных краін не маглі ігнараваць імкненне да міру сваіх народаў.

2. Глыбока ўкаранёнае пачуццё страху перад камунізмам сярод кансерватыўных палітыкаў, якія кіравалі Францыяй і Вялікабрытаніяй. Практычна да апошняга дня яны больш баяліся І. В. Сталіна, чым А. Гітлера, які фармальна заяўляў пра паваж-

лівае стаўленне да хрысціянства і прыватнай уласнасці.

3. «Навізна» фашысцкай тактыкі, якая будавалася на адкрытым ігнараванні агульнапрынятых правілаў міжнароднай дыпламатыі. На працягу пакаленняў еўрапейскія палітыкі традыцыйна зыходзілі з таго, што праблемныя пытанні ў адносінах паміж краінамі абмяркоўваюцца на перамовах і дасягнутыя дамоўленасці, змацаваныя аўтарытэтнымі подпісамі, няўхільна выконваюцца.

Брытанскі прэм’ер-міністр Н. Чэмберлен лічыў, што палітычныя лідары Еўропы былі ў цэлым сумленнымі людзьмі і што іх подпіс пад дакументам варты даверу гэтаксама, як подпіс дзелавога чалавека пад кантрактам. Таму, калі А. Гітлер аб’явіў, што ён хоча інкарпараваць у склад Германіі толькі нямецкамоўнае насельніцтва і не мае «іншых тэрытарыяльных прэтэнзій», Н. Чэмберлен паверыў яму.

Рэалізуючы планы заваяваць «жыццёвую прастору» для арыйскай расы, А. Гітлер пачаў выказваць прэтэнзіі на далучэнне тэрыторый, населеных пераважна немцамі. Адным з такіх раёнаў была развітая ў прамысловых адносінах Судэцкая вобласць Чэхаславакіі.

Спачатку А. Гітлер запатрабаваў для яе *аўтаноміі*, а пасля — далучэння да Германіі. На працягу лета 1938 г. ён пагражаў Чэхаславакіі вайной.

### Мюнхенская дамова

У верасні 1938 г. на канферэнцыі ў Мюнхене А. Гітлер і Б. Мусаліні сустрэліся з кіраўнікамі ўрадаў Вялікабрытаніі і Францыі Н. Чэмберленам і Э. Даладзье. Прадстаўнікі ўрада Чэхаславакіі не былі дапушчаны да ўдзелу ў канферэнцыі. Дэлегацыю СССР таксама не запрасілі на сустрэчу.

Лідары дэмакратычнай Еўропы пагадзіліся з усімі патрабаваннямі А. Гітлера без ніякіх кансультацый з урадам Чэхаславакіі. Судэцкая воб-

ласць перадавалася Германіі ў 10-дзённы тэрмін, узамен Гітлер абяцаў вырашаць усе спрэчныя пытанні мірным шляхам. Урад Чэхаславакіі абавязаны быў у 3-месячны тэрмін задаволіць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Польшчы і Венгрыі. Лідары краін — удзельніц Мюнхенскай канферэнцыі пры гэтым таксама гарантавалі недатыкальнасць новых межаў чэхаславацкай дзяржавы. Фактычная капітуляцыя Вялікабрытаніі і Францыі ў Мюнхене прадэманстравала А. Гітлеру, што сур'ёзных праціўнікаў у Еўропе ён не мае, і канчаткова развязала яму рукі. Пасля Мюнхена Вялікабрытанія і Францыя — з розніцай некалькі месяцаў —

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ




*Падзел Чэхаславакіі пасля Мюнхенскай канферэнцыі*

1. *Выкарыстоўваючы картасхему, апішыце храналогію падзей, што прывялі да знікнення Чэхаславакіі з палітычнай карты свету.*
2. *Вызначце, якія краіны акрамя Германіі атрымалі тэрыторыі Чэхаславакіі.*
3. *Дайце сваю ацэнку дзеянням урадаў гэтых дзяржаў.*

падпісалі з Германіяй пагадненні аб ненападзе, даверыўшыся абяцанням А. Гітлера і мяркуючы, што такім чынам гарантавалі бяспеку ў Еўропе.

Тэрыторыі Чэхаславакіі былі лёгкай здабычай: ужо ў кастрычніку 1938 г. Польшча акупавала частку Цешынскай Сілезіі, а ў лістападзе ў склад Венгрыі былі перададзены паўднёвыя раёны Славакіі і Закарпацця. Увесну 1939 г. германскія войскі акупавалі Чэхію, а Славакія была абвешчана «незалежнай дзяржавай, унутраная і знешняя палітыка якой кантралюецца Германіяй». Чэхаславакія як незалежная дзяржава знікла з палітычнай карты свету.

Ліквідацыя чэхаславацкай дзяржавы ўвесну 1939 г. значыла парушэнне Германіяй Мюнхенскага пагаднення і была крокам да пачатку Другой сусветнай вайны.

Наступствы Мюнхенскага пагаднення былі катастрафічныя не толькі для Чэхаславакіі, але і для краін — удзельніц Мюнхенскай канферэнцыі: праз усяго паўгода — 1 верасня 1939 г. — Трэці рэйх уварваўся на тэрыторыю Польшчы, у верасні таго ж года Францыя і Вялікабрытанія апынуліся ў стане вайны з нацысцкай Германіяй. Такім чынам, англафранцузская палітыка «замірэння» Гітлера, вянцом якой была «Мюнхенская змова», пацярпела фіяска, бо так і не здолела адвесці пагрозу вайны ад краін Заходняй Еўропы і накіраваць германскую ваенную машыну супраць СССР.

Палітыка «замірэння», якую праводзілі дэмакратычныя краіны Еўропы ў 1930-я гг., дагэтуль выклікае пытанні. Яе сутнасць палягала ў тым, каб «улагодзіць» Германію пасля відавочнай несправядлівасці Версальскай дамовы і накіраваць нямецкую агрэсію на Усход, супраць СССР. Палітычныя лідары дэмакратычнай Еўропы сваімі дзеяннямі паспрыялі развязванню Другой сусветнай вайны.

Пазіцыя СССР у адносінах да агрэсіўнай палітыкі Германіі, Італіі, Японіі

**3. Дзейнасць СССР у кантэксце геапалітычнай сітуацыі ў свеце.** Савецкае кіраўніцтва ў 1930-я гг. неаднаразова прапаноўвала заходнім дзяржавам стварыць *сістэму калектыўнай бяспекі*, г. зн. заключыць дамовы аб узаемадапамозе ў выпадку агрэсіі з боку Японіі, Італіі або Германіі. Першыя прапановы на гэты конт былі зроблены яшчэ ў 1934 г. Аднак ад падпісання дагавора, які прадугледжваў стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі, адмовіліся Германія і Польшча, а Вялікабрытанія заставалася пасіўнай у гэтым пытанні.

Савецкі Саюз рашуча асудзіў вынікі Мюнхенскай канферэнцыі 1938 г. У паведамленні ТАСС ад 2 кастрычніка 1938 г. сцвярджалася, што савецкі ўрад «не меў і не мае ніякага дачынення да канферэнцыі ў Мюнхене і яе рашэнняў».

Пасля акупацыі Чэхаславакіі Германіяй пагроза вайны ў Еўропе ўзмацнілася. Савецкі ўрад не выключаў магчымасці заключэння пагаднення Германіі з Вялікабрытаніяй і Францыяй супраць СССР. У гэтай няпростай сітуацыі ўвесну 1939 г. І. В. Сталін пачаў шукаць магчымасці заключэння саюзу з Вялікабрытаніяй і Францыяй на выпадак нямецкай агрэсіі ў Еўропе. Але англа-французская дыпламатыя па-ранейшаму прытрымлівалася палітыкі «замірэння».

Дамова аб ненападзе

Між тым А. Гітлер настойліва прапаноўваў І. В. Сталіну заключыць пакт аб ненападзе. **23 жніўня 1939 г.** міністр замежных спраў Германіі І. фон Рыбентроп і наркам замежных спраў СССР В. М. Молатаў падпісалі ў Маскве *Дамову аб ненападзе паміж СССР і Германіяй* і сакрэтны пратакол да яе. Бакі дамаўляліся не дапусціць ваеннага сутыкнення і размяжоўвалі «сферы дзяржаўных інтарэсаў» паміж Германіяй і СССР. «Сферай інтарэсаў» Германіі былі прызнаныя Заходняя і Цэнтральная Польшча, Літва, а СССР — Заходняя Украіна, Заходняя Беларусь, Латвія, Эстонія, Фінляндыя і Бесарабія.

Значэнне дамовы з Германіяй заключаецца ў тым, што савецкае кіраўніцтва, якое не сумнявалася ў будучым ваенным сутыкненні з гэтай краінай, атрымала два гады, якія імкнулася з максімальнай выгадай выкарыстаць для падрыхтоўкі да вайны.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



«Што выйгралі мы, заключыўшы з Германіяй пакт аб ненападзе? Мы забяспечылі нашай краіне мір на працягу паўтара гадоў і магчымасць падрыхтоўкі сваіх сіл для адпору, калі фашысцкая Германія рызыкнула б напасці на нашу краіну насуперак пакту».

І. В. Сталін, прамова па радыё
3 ліпеня 1941 г.



«На карысць Саветаў трэба сказаць, што Савецкаму Саюзу было жыццёва неабходна адсунуць чым далей на захад зыходныя пазіцыі германскіх армій, з тым каб рускія атрымалі час і маглі сабраць сілы з усіх канцоў сваёй каласальнай імперыі. Калі іх палітыка і была халодна-пралічаная, дык яна была таксама ў той момант у высокай ступені рэалістычная».

У. Чэрчыль, прэм'ер-міністр
Вялікабрытаніі (1940–1945 гг.)

*Параўнайце погляды І. В. Сталіна і У. Чэрчыля на значэнне Дамовы аб ненападзе. Якія знешнепалітычныя падзеі абумовілі яе заключэнне?*

*Версальска-Вашынгтонская сістэма не толькі не згладзіла супярэчнасці паміж вядучымі еўрапейскімі дзяржавамі, але, наадварот, абвастрыла іх. Палітыка «замірэння агрэсара», якую праводзілі ў 1930-я гг. Вялікабрытанія і Францыя, прывяла да аслаблення геапалітычных пазіцый гэтых дзяржаў, пасля чаго Другая сусветная вайна стала непазбежная. «Мюнхенскую змову» большасць гісторыкаў лічаць перадпачаткам Другой сусветнай вайны, бо менавіта гэты акт выступіў адпраўным пунктам непрыхаванай агрэсіі нацысцкай Германіі ў дачыненні да суседніх еўрапейскіх дзяржаў.*

**калі ў свеце…**

1937 г. — заключэнне савецка-кітайскай дамовы аб ненападзе

**на тэрыторыі Беларусі…**

1937 г. — прынянцце трэцяй Канстытуцыі БССР

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія перадумовы і прычыны агрэсіўнай знешняй палітыкі Германіі, Італіі і Японіі ў 1930-я гг.?
2. Чаму Версальская мірная дамова 1919 г. не ўратавала чалавецтва ад новай сусветнай вайны?
3. Складзіце храналагічную табліцу «Свет на шляху да Другой сусветнай вайны».

| Дата | Падзея | Значэнне падзеі |
|---|---|---|
| | | |

4. Прааналізуйце з'яву «палітыка замірэння агрэсара ў 1930-я гг.» паводле плана: прычыны, сутнасць, наступствы.
5. Пералічыце прычыны правядзення палітыкі замірэння агрэсара дэмакратычнымі краінамі Еўропы. Якую з іх вы лічыце асноўнай? Чаму?
6. Якую ролю ў развязванні Другой сусветнай вайны адыграла заключэнне Мюнхенскай дамовы?
7. Ахарактарызуйце палітыку СССР напярэдадні Другой сусветнай вайны.
8. Складзіце схему «Перадумовы Другой сусветнай вайны».
9. Паразважайце, ці можна было пазбегнуць Другой сусветнай вайны. Калі так, то на якім этапе? Абгрунтуйце сваю думку.